УДК 94 (476)

# МЕСЯЦАСЛОЎ ГРЭКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ НОВАЙ КУЛЬТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ

**Корбут Кірыл Мікалаевіч,**
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*У дадзеным артыкуле аналізуюцца вядомыя месяцасловы Грэка-каталіцкай царквы, а таксама змены, якія адбыліся з імі ў сярэдзіне XVII – другой палове XVIII ст. Навізна дадзенай работы складаецца ў параўнальным падыходзе, паміж новымі відамі месяцасловаў уніяцкай царквы і новай традыцыяй імянарачэння ўніяцкіх дзяцей у перыяд з сярэдзіны XVII – другой паловы XVIII ст.*

Прамежкавае становішча уніяцкай царквы паміж праваслаўнай і рымска-каталіцкай традыцыямі непазбежна адчувалася і ў яе літургічным жыцці. Хоць першапачаткова унія ўспрымалася як гарантыя захавання ўсходняга абраду, інтэграцыя уніятаў у лацінскую культурную сферу ў канчатковым выніку прывяла да зменаў у іх літургічных практыках. Змены паступова спрыялі фармаванню змяшанай літургічнай традыцыі, якую даследчыкі часам называюць «трэцім абрадам». Месяцаслоў уніяцкай царквы, нароўні з іншымі літургічнымі новаўвядзеннямі з’яўляецца адным з аспектаў, якія паўплывалі на фарміраванне культурнай ідэнтычнасці Грэка-каталіцкай царквы.

Другая палова XVII стагоддзя прынесла розныя новаўвядзенні ва уніяцкія месяцасловы. Ўзмоцнены культ шанавання Багародзіцы пасля Трыдэнскагоа сабора ў заходняй традыцыі прывёў да з’яўлення новых святаў і ў традыцыі ўніяцкай царквы. Так япіскап Якаў Суша у 1661 годзе пашырыў святкаванне ў гонар Зачацця Найсвяцейшай Багародзіцы з аднадзённага малога свята ў дванадзесятае, надзяліўшы яго пасвяточнымі імпрэзамі (8-дзенным святкаваннем)[1] [4, с. 39]. Ёсць таксама сведчанні таго, што звычайныя памятныя дні таксама маглі адзначацца з пасвяточнымі шанаваннямі на працягу тыдня. Напрыклад,

[1] У праваслаўнай царкве пасвяточныя дні маюць толькі 12 асноўных святаў у гонар Госпада і Багародзіцы. Традыцыя 12 – святаў была сфармавана вельмі рана, прыкладна да канца VI ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

П. Камінскі паведамляе, што ў Жыровічах ў 1684 годзе святкаванне Дня Васіля Вялікага, як заступніка базыльянскага манаскага ордэна, працягвалася тыдзень пасля фактычнага свята [5, с. 112]. Вядомыя факты напісання богаслужбовых тэкстаў для новых святаў уніяцкай царквы. На 18-м Капітуле базыльян ў Навагрaдку, да свята Зачацця Найсвяцейшай Багародзіцы дадалося новае свята «Наведванне» [5, с. 149]. Кароткая служба свята з'яўляецца пад назвай «Наведванне» і ўключаецца ў новы ўніяцкі Імшал 1691 г. з заўвагай аб яго добраахвотным здзяйсненні. Іншае свята з лацінскім паходжаннем развіілося вакол тэмы пакут Багародзіцы. Свята было зацверджана толькі у 1720 годзе на Замойскага саборы, як «Festum Dolorosae Beatissimae Mariae»[1] [3, с. 44]. Дадатковыя святкаванння ў гонар Найсвяцейшай Багародзіцы былі прадыктаваны тым, каб наблізіць дагматычнае вучэнне уніяцкай царквы да каталіцкага, у якой на пачатку XVIII ст. развіваўся культ шанавання Багародзіцы, з'яўлення новых свят у яе гонар і асэнсаванне новых тэалагічных трактатаў па марыялогіі.

У другой палове XVII стагоддзя з'яўляецца традыцыя шанавання заходніх святых і іх ўключэнне ва ўніяцкі месяцаслоў. Звесткі аб уключэнні такіх каталіцкіх святых, як Антоній Падуанскі, Францыск Асізскі, святы Казімір, святы Станіслаў Кракаўскі хаця і не адлюстраваны ў вядомых агульнаўніяцкіх месяцасловах, якія дайшлі да нас, але некаторым з гэтых святых захаваліся службы на царкоўнаславянскай мове, якія былі складзеныя з агульных паслядоўнасьцяў святым [5, с. 89]. Значна пазней, у апошнія гады XVIII стагоддзя, многія цэрквы ў Навагрудскім раёне мелі, напрыклад, выявы Ігната Лаёлы, Антонія Падуанскага і святога Казіміра. Характэрны факт шанавання Антонія Падуанскага даследчыкамі тлумачыцца агульнай папулярнасцю святога ў Польшчы. Але гэта былі мясцовыя шанаванні, так вядомы факт, што базыльяне Холмска хацелі адзначыць яго свята у 1732 годзе.

Адметна і ўсталяванне святкавання ў гонар святога Францыска Ассізскага. У Імшале пачатку XVIII стагоддзя Францыск называецца «наш святы, манаскі ойча, Патрыярх Францыск» [5, с. 111]. У новых тэкстах набажэнстваў Францыск называецца на польскі манер «Францішкам».

У той час як ва ўніяцкі царкоўны каляндар былі дададзены новыя памяці заходніх святых, шанаванне пэўных святых рускай традыцыі былі скасаваныя. У часаслове мітрапаліта Гаўрыіла Календы датаванага 1670 г. Былі выключаны звышгодныя Антоній і Феадосій Пячэрскія. Цэнзараваны падыход можна адзначыць у Імшале 1692 г. мітрапаліта Кіпрыяна Жахоўскага, з якога былі таксама выключаны некаторыя святыя Русі [1, с. 34]. У прыватнасці з Месяцаслову зніклі ушанаваныя ў праваслаўнай традыцыі такія святыя як: звышгодны Рыгор Палама, звышгодны Сімяон Сербскі, Сергій Раданежскі і Ян Рыльскі. Мітрапаліт Жахоўскі папрасіў парады ў кардынала Нерлі ў Рыме з нагоды скасавання дней памяці рускіх святых. Яму было загадана апусціць гэтых святых і замест іх дадаць імя благаслаўлёнага Язафата.

Культ святога Язафата адразу ж пасля яго смерці пачаў распаўсюджвацца ў буйных ўніяцкіх сталіцах, такіх як Вільня і Полацк . Пасля яго беатыфікацыі ў 1643 г. святкаванне ў яго памяць было ўключана і ва уніяцкія Месяцасловы. Аднак традыцыя шанавання благаслаўлёнага Язафата ідзе паралельна

[1] Свята Балеснай Блажэннай Марыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з працэсамі ўключэння заходніх святых ва уніяцкія месяцасловы. У сярэдзіне XVII ст. сярод манахаў-базыльян з'яўляецца традыцыя манаскага імянарачэння ў гонар Язафата Кунцэвіча.

Новыя традыцыі, святкі і месяцасловы былі замацаваны паўсюдна пасля Замойскага сабора у 1720 годзе, пасля якога з'яўляецца іканаграфічная традыцыя ў гонар заходніх святых, складаюцца новыя службы, адбываюцца істотныя змены ў традыцыі імянарачэння. Так напрыклад спавядальных ведамасцях парафіян Навагрудскага дэканата за 1746 г. сярод тых, хто нарадзіўся ад 1740 па 1746 гг. з'яўляецца новая тэндэнцыя імянарачэння ў гонар святых: Дамініка, Францыска, Станіслава і Казіміра [2, с. 85]. Дадзеныя працэсы сведчаць аб істотным змяненні ў культурнай традыцыі ўніяцкай царквы, не толькі ў вышэйшых іерархічных колах, але і сярод простага насельніцтва.

## Літаратура


1. Ваврик, М. 1985 Служебник митрополита Киприана Жоховского 1692 р. Геneза й аналіза / М. Ваврик. Romae: Analecta OSBM, Series II, Sectio II, Vol. 18., 1985. - 341 с.
2. Нацыянальны Гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф.1781 Воп. 26 Спр. 1181. Л. 75 – 112.
3. Nowakowski, P. Statuty synodu Zamojskiego1720 roku / P. Nowakowski. Kraków, 2020. – 420 s.
4. Skoczylas, I. Sobory eparchii chełmskiej XVII wieku: program religijny Slavia Unita w Rzeczypospolitej / I. Skoczylas, przeł. A.Gil. – Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 2008. – 176 s.
5. Takala-Roszczenko, M. The 'Latin' within the 'Greek': The Feast of the Holy Eucharist in the Context of Ruthenian Eastern Rite Liturgical Evolution in the 16th–18th Centuries. M. Takala-Roszcenko / - Joensuu: University of Eastern Finland Joensuu, 2013. – 294 p.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова